раз паўстае пытанне аб прыемах выкарыстання мастацкіх твораў і фактаў мастацкага жыцця сусвету як у лекцыйным працэсе, так і на семінарах, у заданнях для самастойнай працы студэнтаў.

Намі распрацаваны шэраг заданняў, якія трэба выканаць самастойна, а потым уключыць у працэс абмеркавання на семінары. Такімі заданнямі з'явіліся: падбор матэрыялаў да пэўных відаў навучальнай і выхаваўчай работы па курсу «Мастацтва»; аналіз пары дзяцінства і юнацтва знакамітых дзеячаў мастацкай культуры; назіранне за ўспрыманнем твораў мастацтва прадстаўнікамі розных узроставых груп; нарэшце, аналіз любімых кніг, вершаў, мелодый, спектакляў перыяду свайго асабістага дзяцінства, роздум пра любімых мастакоў. Лагічным завяршэннем гэтага накірунку працы з'яўляецца курсавая работа па педагогіцы, дзе кожная з тэм патрабуе аналізу функцыянавання з'яў мастацтва ў жывым педагагічным працэсе.

Цікава паназіраць, як студэнты адгукнуліся на тыя заданні, дзе выбар імі тэм і арыентацыя на тых ці іншых асоб былі амаль не абмежаваны. У асноўным гэта заданні па аналізу педагагічных з'яў і праблем дзяцінства і юнацтва знакамітых дзеячаў культуры. Мы меркавалі, што выбар будзе неяк звязаны з будучай прафесіяй: будучыя мастакі прааналізуюць пачатак жыццевага шляху мастакоў, рэжысеры - дзеячаў тэатра і г.д. Але атрымалася інакш. У спіс асоб, чые гады дзяцінства і маладосці зацікавілі студэнтаў, трапілі вельмі разнастайныя асобы (сярод іх, акрамя дзеячаў мастацтва,-Аляксандр Македонскі, З.Фрэйд, О.Кромвель). Сярод асоб, абраных студэнтамі 313 групы (выяўленчае мастацтва), - В.-А.Моцарт, Д.Хармс, А.Дункан. Будучыя рэжысеры, навучэнцы 314 і 315 груп, абралі А.Пушкіна, С.Рахманінава, М.Урубеля, эстрадную зорку Мадонну. Будучыя сацыяльныя педагогі і спецыялісты мэнеджмэнту сацыякультурнай сферы аналізавалі маладосць Рафаэля і Маякоўскага, Баха і Далі, Бетховена і вядомага кінарэжысёра Разанава.

Аналіз пісьмовых работ, выступленняў на семінарскіх занятках, тэм курсавых дазваляе выказаць меркаванне, што выбар больш залежыць ад індывідуальных схільнасцей, густу студэнта. Кансультацыі з выкладчыкамі псіхалогіі, якія выкладалі і праводзілі свае даследаванні і назіранні на курсе ў мінулым навучальным годзе, пацвердзілі нашу здагадку: выбар асоб для аналізу адбываецца часцей за ўсе па прынцыпу ідэнтыфікацыі. Тут мае месца ідэнтыфікацыя ў тыпе тэмпераменту, такіх індывідуальных асаблівасцей асобы, як экстравертнасць-інтравертнасць, эмпатыя і іншых, што акрэсліваюць характар узаемадзеяння з людзьмі і сусветам. Такая матывацыя выбару аб'екта для аналізу суаднасіцца з узроставай асаблівасцю ўспрымання моладдзю мастацтва: юнак альбо дзяўчына міжволі шукаюць у героях мастацкіх твораў «люстэрка» - тыя рысы, абставіны, праблемы, якія нагадваюць іх асабістыя цяжкасці і здабыткі.

Такую ж зацікаўленасць і вялікі роскід прапаноў для абмеркавання даюць заданні па аналізу асабістых мастацкіх захапленняў перыяду дзяцінства і юнацтва. Вывучэнне агульнага, тыповага ў індывідуальных матэрыялах, якое адбываецца на семінары пад кіраўніцтвам выкладчыка, замацоўвае цікавасць студэнтаў да вывучэння педагагічных з'яў. У непаўторнасці асобы (сваёй альбо свайго куміра) яны вучацца бачыць і тое тыповае, што паддаецца вывучэнню, аналізу і пазітыўнаму ўздзеянню.

Такім чынам, у аснове прыемаў уключэння з'яў мастацтва ў навучальны працэс па курсу агульнай педагогікі ляжыць, акрамя эмацыянальнасці, яшчэ і прынцып індывідуалізацыі заданняў. Рэалізацыя азначанага прынцыпу дазваляе актывізаваць пазнавальную дзейнасць студэнтаў-культуролагаў. Аналіз тыповага ў непаўторнасці творчай асобы дазваляе наблізіць акадэмічны курс да прафесійных патрэб будучых працаўнікоў у сферы культуры.

Грыгаровіч Я.Д.,
дацэнт

## МЕСЦА САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ Ў СТРУКТУРЫ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ

Спробы правядзення рэформы вышэйшай школы не прывялі да істотнага поспеху: рэальнага зруху ва ўзроўні падрыхтоўкі спецыялістаў не зафіксавана, актыўнасць пазнавальнай дзейнасці не дасягнула такой ступені, як меркавалася, патрэба ў глыбокіх, моцных ведах не набыла дамінуючага характару. Узнікла неабходнасць новых пераўтварэнняў і пошукаў спосабаў уздзеяння на «стаячага ў чарзе за дыпломам студэнта».

Галоўная відавочная прычына, якая ляжыць на паверхні захлынуўшайся перабудовы, - адсутнасць не толькі дэкларaванага, але і рэальнага сацыяльнага заказу на добра падрыхтаванага, кампетэнтнага, высокапрафесійнага, ініцыятыўнага спецыяліста, здольнага нестандартна, творча арганізоўваць сваю дзейнасць, нетрывіяльна падыходзіць да рашэння любой нечаканай задачы ці сітуацыі. Адсутнасць прамой, непасрэднай сувязі паміж якасцю атрыманых ведаў і сацыяльным узроўнем будучай дзейнасці, паміж паспяховасцю і інтэнсіўнасцю навучання і памерам матэрыяльнага забеспячэння прывяла да пазна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вальнай апатыі, разгрупавання па многіх (не звязаных з атрыманнем адукацыі) пытаннях, да зніжэння прэстыжу ведаў і адукаванасці.

Фарміраванне сацыяльнага заказу мае аб'ектыўны характар і вызначаецца зусім не педагогам. Аднак прывучэнне студэнта да пастаяннай пазнавальнай работы, да пошуку і спажывання новых ведаў, развіццё патрэбы ва ўдасканаленні, у інтэнсіўным росце інтэлектуальнага патэнцыялу асобы даюць падставу ў прагнастычным плане змяніць сацыяльную і пазнавальную абыякавасць, якая характарызуе сучаснае грамадства, і пераразмеркаваць грамадскія прыярытэты.

Таму праблема бесперапыннай самастойнай работы студэнтаў ва універсітэце па сваёй значнасці вырастае да глабальных задач, што ўплываюць на сацыяльны і эканамічны прагрэс нашага грамадства.

Значнасць самастойнай работы студэнтаў у агульнай сістэме падрыхтоўкі спецыяліста вызначыла цікавасць навукоўцаў і педагогаў да тэарэтычных і метадычных аспектаў яе рэалізацыі. Гэта цікавасць асабліва ўзрасла ў апошнія гады ў сувязі з перабудовай вышэйшай адукацыі і павелічэннем аб'ему індывідуальных, практычных заняткаў у агульнай структуры аўдыторных і пазааўдыторных заняткаў.

У навуковай літаратуры існуе некалькі трактовак самастойнай работы студэнтаў. Яна разглядаецца ў розных даследаваннях як форма арганізацыі навучальнага працэсу, метад, прыем або сродак навучання, як эквівалент пазнавальнай або творчай дзейнасці і нават сінонім разумовай самастойнасці студэнтаў.

Можна пагадзіцца з тым, што ў розных навучальных сітуацыях у залежнасці ад дыдактычных задач і канкрэтных умоў самастойная работа можа выступаць або як метад, або як сродак, або як прыём навучання. Аднак найбольш лагічна вызначыць яе ў шырокім сэнсе паняцця як пазнавальную дзейнасць, што прысутнічае ва ўсіх элементах навучальнага працэсу ў ВНУ, і ў вузкім сэнсе - як адзін са спецыфічных відаў вучэбных заняткаў, як пазааўдыторную дзейнасць студэнта па авалоданні ведамі без выкладчыка.

У першым выпадку задача педагога заключаецца ў кіраванні гэтай дзейнасцю на любых вучэбных занятках, у стварэнні для яе аптымальных умоў, актывізацыі і стымуляванні ўсяго пазнавальнага працэсу. У другім жа выпадку патрабуюцца мэтанакіраваныя, загадзя прадуманыя дзеянні ўсяго прафесарска-выкладчыцкага складу па планаванню, арганізацыі, стымуляванню, уліку і кантролю самастойнай работы студэнта. Пры гэтым кіраванне ажыццяўляецца ўскосна, апасродкавана, праз сістэму дакладна сфармуляваных патрабаванняў, заданняў, розных відаў творчых работ. Гэта значыць, што размова ідзе аб абавязковым педагагічным кіраўніцтве любым відам самастойнай работы студэнтаў і кантролі за яе ажыццяўленнем.

Аднак пры гэтым трэба ўлічваць, што паспяховасць самастойнай работы студэнтаў залежыць ад чатырох фактараў.

1. Матывацыйна-патрэбнасны: жаданне і імкненне да пазнавальнай дзейнасці, дастаткова высокая матывацыя самастойнай работы, патрэба пастаянна працаваць, павышаць свой інтэлектуальны патэнцыял, аб'ем і якасць ведаў.

2. Кагнітыўны: уменні і навыкі рэалізацыі самастойнай дзейнасці, валоданне спосабамі набыцця і засваення ведаў, самаадукацыі і самавыхавання.

3. Арганізацыйны: стварэнне ўмоў для паспяховага ажыццяўлення самастойнай работы, у тым ліку забеспячэнне неабходнага для яе бюджэту часу ў адпаведнасці з навукова абгрунтаванымі санітарна-гігіенічнымі нормамі, наяўнасць рабочага месца, матэрыяльнай базы, вучэбнай, метадычнай і дапаможнай літаратуры, тэхнічных сродкаў, музычных інструментаў і інш.

4. Метадычны: педагагічна мэтазгоднае кіраванне самастойнай работай з боку выкладчыкаў з дакладным вызначэннем (асабліва ў першыя гады навучання ва універсітэце) штодзенных разнастайных і пасільных заданняў, прыблізных затрат часу, магчымых спосабаў і варыянтаў выканання заданняў.

Мяркуем, што першы фактар найбольш важны і на яго рэалізацыю накіраваны іншыя. Ен прадугледжвае і прафесійную скіраванасць асобы, што з'яўляецца адной з мэт навучання ва універсітэце, праяўляецца як сістэма матываў дзейнасці і паводзін студэнта. Стварэнне ўмоў для замацавання станоўчых адносін да пазнавальнай дзейнасці і фарміраванне прафесійнай матывацыі павінны быць асновай работы выкладчыцкага калектыву. Без сфарміраванай матывацыйна-патрэбнаснай сферы ў інтэнсіўнай разумовай дзейнасці немагчыма падрыхтоўка творчага, інтэлігентнага спецыяліста, здольнага выкарыстоўваць дасягненні сучаснай навукі і перадавога прагрэсіўнага вопыту.

Павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыяліста патрабуе ў першую чаргу стварэння сістэмы бесперапыннай работы студэнта па набыццю, перапрацоўцы, засваенню і практычнаму выкарыстанню ведаў, уменняў і навыкаў, перабудовы яго свядомасці на сістэматычную самастойную работу без штодзеннай прывычнай школьнай дазіроўкі. Надзвычай важна таму з першых дзен навучання ва універсітэце паказаць неабходнасць штодзённай работы, падрыхтоўкі да семінарскіх і практычных заняткаў, абавязковага выканання пат-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

рабаванняў выкладчыкаў, чытання рэкамендаванай літаратуры. Стэрэатып недобрасумленнай вучэбнай дзейнасці, калі няма вострай неабходнасці ў сістэматычнай рабоце, разбэшчвае навучэнцаў, выклікае бяздзейнасць, безадказнасць і, як вынік, нізкую прафесійную падрыхтоўку.

Бесперапыннасць самастойнай работы забяспечваецца аптымальным спалучэннем трох асноўных задач: планаваннем, навуковай арганізацыяй вучэбнай працы (пры выкарыстанні розных метадаў і сродкаў навучання) і кантролем за яе вынікамі.

Планаванне мае на мэце вызначэнне асноўных відаў, формаў і тыпаў самастойнай работы студэнтаў, якія вынікаюць з патрабаванняў вучэбнага плана і праграмы курса, разгляд аб'ему, зместу і структуры самастойнай работы студэнтаў, распрацоўку формаў, метадаў і сродкаў яе актывізацыі, дакладнае вызначэнне нарматываў часу на яе выкананне ў адпаведнасці з важнасцю курса і загружанасцю студэнтаў. Навуковая арганізацыя працы дыктуе стварэнне ўмоў для яе паспяховай рэалізацыі: вучэбна-метадычнае аснашчэнне, забеспячэнне педагагічнага кіраўніцтва, распрацоўка дыдактычных сродкаў, арганізацыя дзейнасці студэнтаў, выбар аптымальных стымулюючых метадаў навучання, вызначэнне відаў тэхнічных сродкаў.

Кантроль прадвызначае ўстанаўленне пэўнай структуры кантралюючых мерапрыемстваў у міжсесіенны перыяд, распрацоўку формаў сродкаў кантролю за самастойнай работай, вызначэнне аб'ектаў кантролю па розных дысцыплінах.

Станоўчы вынік залежыць ад сістэматычнасці, паслядоўнасці, бесперапыннасці і пастаяннага ўскладнення зместу і методыкі ажыццяўлення самастойнай работы; ад яе скіраванасці на спецыфіку будучай прафесійнай дзейнасці і індывідуальных асаблівасцей студэнтаў; ад пасільнасці, цікавасці, разнастайнасці і крэатыўнасці заданняў для індывідуальнай работы; ад канкрэтнасці і падкантрольнасці вынікаў (анатацыя, рэцэнзія, рэферат, пісьмовая работа і інш.), з якімі абавязкова на першых этапах знаёміцца выкладчык. Залежыць вынік і ад таго, наколькі паслядоўна планаваннем, арганізацыяй, улікам, стымуляваннем самастойнай работы, а таксама кантролем за яе прадукцыйнасцю займаюцца ўсе падраздзяленні вышэйшай установы (вучэбна-метадычны савет, вучэбны аддзел, дэканаты, кафедры, бібліятэка).

Марэцкі А.І.,
дацэнт

## АКТЫВІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ

1. З усёй сукупнасці праблем, што звязаны з арганізацыяй завочнага навучання ва універсітэце, найболш вылзяляецца праблема ўдасканалення сістэмы кіравання самастойнай працай студэнтаў у міжсесіённы перыяд, таму што асноўнай формай набыцця ведаў для студэнта-завочніка з'яўляецца яго навучальная дзейнасць.

2. Аналіз кантынгенту студэнтаў факультэта завочнага навучання паказвае, што тут у наяўнасці фактары, якія абумоўліваюць фарміраванне пазнавальнай актыўнасці студэнтаў-завочнікаў: папярэдняя сярэдняя спецыяльная адукацыя, стаж работы па спецыяльнасці, усвядомленая матывацыя паступлення ва універсітэт. Актывізацыі самастойнай работы завочнікаў садзейнічае і склаўшаяся на факультэце сістэма арганізацыі і кіравання навучальнай дзейнасцю: заданне ў міжсесіённы перыяд, кантрольныя і курсавыя работы, кансультацыі ў дні завочніка і інш.

3. Разам з тым аналіз анкетных дадзеных выявіў шэраг недахопаў у арганізацыі дамашняй навучальнай работы студэнтаў. Галоўны з іх -- няўменне рацыянальна размеркаваць свой час (53% апытаных), адсюль вынікае нерытмічнасць у занятках. Так, на пытанне: «Ці рэгулярна Вы займаецеся ігрой на фартэпіяна?» - 43% апытаных адказалі: «Эпізадычна».

4. Уяўляецца магчымым дапусціць, што ў сістэме самастойнай работы студэнтаў-завочнікаў многія яе звёны патрабуюць значнага ўдакладнення, пошуку новых шляхоў яе арганізацыі і кіравання. Адна з галоўных праблем, як павысіць ролю выкладання ў пастаноўцы канкрэтных мэт самастойнай работы завочніка. Шлях да рашэння дадзенай праблемы - клопат выкладчыка аб дакладнай і паслядоўнай пабудове этапаў навучальнай работы студэнтаў. Змест навучальных дысцыплін таксама павінен быць размежаваны на падставе дакладных апорных сэнсавых вузлоў.

5. Вялікую дапамогу завочнікам аказваюць вучэбна-метадычныя матэрыялы. На пытанне ў анкеце: «У якой меры Вас задавальняе забяспечанасць універсітэцкай бібліятэкі літаратурай ?» - 68% студэнтаў-завочнікаў далі адмоўныя адказы. Таму важнейшая задача кожнага выкладчыка - распрацоўка вучэбна-метадычных матэрыялаў, якія найбольш поўна ўлічваюць спецыфіку завочнага навучання.

6. Адной з формаў арганізацыі самастойнай навучальнай работы студэнтаў у міжсесіённы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ